Клімава А.І., ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Васюк Т.І.,

# ТЭНДЭНЦЫІ ЎПЛЫВУ ТРАДЫЦЫЙ НА АЎТАРСКУЮ ПЛАСТЫКУ Ў СУЧАСНАЙ КЕРАМІЦЫ

Вытокі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва керамікі на тэрыторыі Беларусі ідуць з першабытных часоў. За доўгі і складаны шлях развіцця нашы продкі стварылі неацэнную мастацкую спадчыну, прыклады якой уражваюць сваім багаццем і разнастайнасцю формаў, арыгінальнасцю матываў дэкору. Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва керамікі вызначаецца характэрнымі нацыянальнымі рысамі, у той жа час многія узоры сведчаць пра агульнасць гістарычнага развіцця, гаспадарчыя і творчыя кантакты з іншымі народамі. Менавіта шматвяковыя і тысячагадовыя традыцыі, глыбокія карані і багатыя набыткі нашых продкаў даюць моцны падмурак для сучаснага мастацтва керамікі. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва вырашае практычныя і мастацкія задачы, садзейнічае мастацкай арганізацыі прадметнага асяродзя, якое адпавядае эстэтычным запатрабаванням чалавека ў сучасным жыцці.

**Мэта:** адлюстраваць напрамкі уплыву традыцый беларускай керамікі на сучасную дэкаратыўную аўтарскую пластыку.

Зварот да традыцый у сучасным мастацтве керамікі—вельмі актуальна. Таму што перад намі даўно забытыя, но багатыя магчымасці. Зварот да мінулага—повад для разважання і адпраўная кропка ў творчасці. Гарманічнае, суладнае спалучэнне архаічнага і аўтарскага, творчага светаўспрымання і будзе сучасным дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам керамікі.

Такой адправной кропкай у творчасці можа паслужыць асобы від старажытнага мастацтва—кафлярства, які меў шырокае распаўсюджанне ў XIV—XVI стст. Кафляй абкладвалі сцены печаў, камінаў. Яна выкарыстоўвалася для абліцоўкі сцен будынкаў, што надавала ім непаўторны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выгляд. У сваім развіцці кафля прайшла некалькі этапаў—ад вырабаў цыліндрычнай ці конусападобнай формы, да “сотавай” кафлі з квадратнай паддоннай часткай. Да XV ст. адносіцца з’яўленне плоскай кафлі, у значнай ступені набліжанай да сучаснага выгляду гэтых керамічных вырабаў. Плоская паверхня кафлі—выдатная карцінная плоскасць, на ей сталі з’яўляцца разнастайныя геаметрычныя, раслінныя, зааморфныя, антрапаморфныя матывы і сюжэты, выкананыя ў нізкім рэльефе. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў адбываўся працэс ўдасканальвання кафлі, выпрацоўвалася форма, сістэма размяшчэння аздабленняў. З цягам часу змяняліся патрабаванні да гэтых мастацкіх вырабаў. Менавіта кафляная плоскасць дала магчымасць для вырашэння новых задач у сучасным мастацтве. Гэта новая задача трансфарміравалася ў вытворчасць керамічнай пліткі(керамін) і новую форму аўтарскай пластыкі—дэкаратыўнае пано, якое може уваходзіць у ансамбль і арганізоўваць прасторавае, архіцектурнае асяродзе. У сучасным дэкаратыўна-прыкладном мастацтве керамікі мастакі вырашаюць задачы стварэння ансамбля, аб’яднанага агульнай пластычнай і мастацкай задумай. Формы твораў падпарадкоўваюць агульнаму стылявому напрамку інтер’ера. Цікавасць праяўляецца не толькі да формы і матэрыялу, але і да прасторавай актыўнасці формы. Кераміка пакідае межы інтэр’ераў, вялікія керамічныя формы ставяцца ў грамадскіх памяшканнях, садах і парках. Яны арганізуюць прастору, ствараюць своеасабоівае па сваіх эстэтычных якасцях асяродзе.

Прааналізаваўшы дадзены матэрыял, я паспрабавала рэалізаваць сваю творчую ідэю — стварэння ансамбля аб’яднанага агульнай пластычнай задумай. Ансамбль складаецца з трох дэкаратыўных пано, выкананых у грубым шамоце і ў адной тэхніцы. Выразным сродкам з’яўляецца графічны малюнак. Менавіта лінія стварае планавасць, прастор , вырашае святло і тень. Графіка, як сродак дэкору прымяняўся і прымяняецца ў многіх відах дэкаратыўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладнога мастацтва. Нярэдка яго роля набывае самадастатковасць у аздабленні твораў.

Вынаходства графічнага малюнка, як сродка дэкору можна з упэўненасцю чэрпаць з самага значнага гістарычнага перыяда мастацтва керамікі—архаікі. Усе, што зарадзілася у гэты перыяд—багатыя набыткі для творчасці ў сучасным мастацтве. Фізічныя ўласцівасці гліны адкрылі прастор і для пластычных і для арнаментальных пошукаў. Гліняны матэрыял даў магчымасць распрацаваць уласцівыя толькі яму прыемы арнаментыкі і матыву дэкору: адбіткі канцом палачкі, з наматаным на яе шнуром, рознымі вострымі прадметамі, тарцом лапаткі, пальцамі, пазногцямі і іш. Разнастайнае камбінаванне гэтых рысак, ямак і наколаў стварае безліч варыянтаў дэкору.

На аснове архаічнага дэкору ствараецца графічны малюнак. Назва ансамбля"Вір" падпарадкоўваецца тэхнікі выканання. Дынаміка, прастор, шматпланавасць ўсе вырашаецца пры дапамозе лініі, як выразным сродкам кампазіцыі. Пры дапамозе графіцы ствараюцца розныя фактуры і тэкстуры, што надае больш выразнасці твору. Краявіды ў ансамблі—гэта ліра-эпічныя сказаніі, якія адлюстроўваюць сутнасць стыхіі прыроды: кругазварот, сталы рух. Гэта лаканічная пластычная мова, стрыманы, амаль манахромны каларыт разлічаны на філасоўска-вобразнае адлюстраванне рэчаіснасці.

Чаму менавіта зварот да архаічнасці мае вялікае значэнне, таму што творчая ідэя мастака сення пабудаваная на традыцыях будзе мець глыбіню і абгрунтаванасць думкі.Новыя тэндэнцыі ў развіцці керамікі дазволіла прасачыць адметная падзея—першая Беларуская трыенале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Бяспрэчныя здабыткі паказала гэтая выстава асабліва яскрава вылучаюцца працы В. Калтыгіна, у якіх уласныя, нацыянальныя, старажытныя здабыткі суладна гарманіруюць з аўтарскімі ідэямі.

Невыпадкова усе дасягненні старажытнага перыяду, маюць для нас вялікае значэнне. Усе што было зроблена да нас, мы павінны выкарыстоўваць зараз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму што ў сучасным дэкаратыўна-прыкладном мастацтве керамікі павінна існаваць агульная канцэптуальная ідэя— сувязь часоў: ад архаікі да сучаснасці.

Спіс літаратуры:


1. *А.А. Трусаў*. Беларускае кафлярства. Мінск. 1993
2. *Н.І. Здановіч, А.А. Трусаў*. Беларуская паліваная кераміка XI - XVIII стст. Мінск, "Навука і тэхніка", 1993
3. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. Мінск: "Беларуская энцыклапедыя" імя Патруся Броўкі, 1993.
4. Гісторыя беларускага мастацтва (у шасці тамах). Мінск, "Навука і тэхніка", 1987
5. *Лазука Б. А*. Гісторыя беларускага мастацтва (у двух тамах). Мінск, "Беларусь", 2007
6. Часопісы «Мастацтва” 2009-2010


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ